**Экзамен па гісторыі Беларусі**
**10 клас (1 варыянт)**

1. Дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння, аўтар навукова-папулярнага геаграфічнага апісання беларускіх зямель, выдадзенага ўпершыню ў 1919г.:
а) Я.Карскі; б) М.Федароўскі;
в) А.Смоліч; г) Е.Раманаў.

2. Галоўны сродак барацьбы партыі сацыял – рэвалюцыянераў (эсераў) супраць царызму:
а) палітычная агітацыя; б) палітычны тэрор;
в) рэформы; г) усталяванне дыктатуры пралетарыяту.

3. Спроба часткай буржуазіі і генералітэту усталявавання ваеннай дыктатуры ў канцы жніўня 1917г.:
а) Двоеўладдзе; в) Карнілаўшчына; в) Калчакаўшчына; г) Прышчэпаўшчына.

4. Кіраўнік Беларускага штаба партызанскага руху падчас Вялікай Айчыннай вайны (БШПР):
а) П.Панамарэнка; б) П.Машэраў; в) П.Калінін; г) К.Заслонаў.

5. Суаднясіце:

| | |
|---|---|
| 1) ТБШ; | а) дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй; |
| 2) "санацыя"; | б) БСРГ; |
| 3) масавая палітычная арганізацыя ў Заходняй Беларусі; | в) "аздараўленне"; |
| 4) пакт Молатава-Рыбентропа; | г) "культурна-асветніцкая арганізацыя". |

6. Калі быў падпісаны Брэсцкі мір?
а) 3 сакавіка 1919; б) 19 мая 1923;
в) 3 сакавіка 1918; г) 23 лютага 1920.

7. Выканаўчы орган улады БНР – народны сакрытарыят узначаліў:
а) І. Варонка; б) А. Смоліч; в) А. Луцкевіч; г) І. Серада.

8. Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка афіцыйна была абвешчана:
а) 10 снежня 1925г.; в) 15 ліпеня 1924г.;
б) 18 чэрвеня 1923г.; г) 3 мая 1926г.

9. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) у Смаленску вядома тым, што прыняла рашэнне:
а) аб аб'яднанні БССР з Літоўскай ССР;
б) аб утварэнні БССР;
в) аб дапамозе польскім рабочым у правядзенні рэвалюцыі.

10. Якім чынам бальшавікі ўсталявалі сваю ўладу у Мінску восенню 1917 года?
а) перамаглі ў выніку ўзброенага паўстання;
б) выклікалі верныя ім часта Заходняга. фронту;
в) у выніку дэмакратычных выбараў у Мінскі Савет;
г) шляхам кааліцыі з іншымі палітычнымі сіламі.

11. Дзяржаўнай мовай на Беларусі ў 1924-1929 гг. з'яўлялася:
а) руская; б) беларуская і руская;
в) беларуская, польская, яўрэйская; г) беларуская, руская, польская, яўрэйская.

12. Першае ўзбуйненне БССР адбылося ў:
а) 1924г.; б)1923 г.; в)1925 г.; г) 1921 г.

13. Пашпартная сістэма была ўведзена ў СССР у гэтым годзе:
а) 1932г.; б) 1933г.; в) 1934г.; г) 1935г.

14. Другая Устаўная грамата БНР была прынята ў:
а) 21 лютага 1918г.; б) 9 сакавіка 1918г.; в) 25 сакавіка 1918г.; г) 12 лютага 1918г.

15. Впішыце правільны адказ:
а) Карэнныя змяненні, пераварот у грамадска- палітычным ладзе, які азначае зваржэнне старога і ўстанаўленне новага дзяржаўнага ладу____________.
б) Далучэнне з дапамогай сілы адной дзяржавай тэрыторыі (альбо яе часткі) другой дзяржавы ____________.
в) Самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады альбо шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца асобнай нацыянальнасці, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы __________.
г) Вызначэнне палітычнага рэжыму, пры якім улада сканцэнтравана ў руках палітычнага лідэра, што вядзе да яе празмернай цэнтралізацыі і зніжэння ролі прадстаўнічых органаў улады _________.

**Экзамен па гісторыі Беларусі**
**10 клас (2 варыянт)**

1. Вырашэнне важнейшых праблем сацыяльна- эканамічнага і палітычнага жыцця краіны (праблема вайны і міру, аграрнае пытанне, нацыянальнае пытанне) Часовы ўрад :
а) адкладваў да созыву Устаноўчага сходу;
б) вырашаў паслядоўна;
в) перадаваў паўнамоцтвы Саветам;
г) перадаваў на вырашенне мясцовым органам улады;
д) увогуле не абмяркоўываў.

2. Якая адміністацыйна- тэрытарыяльная адзінка была ўтворана на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў чэрвені 1917г.:
а) Заходняя вобласць; б) Заходняя камуна;
в) Паўночна –Заходні край; г) ЛітБел;
д) ССРБ.

3. Вызначце правільную паслядоўнасць:
а) звяржэнне Часовага ўрада; б) заключэнне Брэсцкага міру;
в) карнілаўскі мяцеж; г) стварэнне Аблвыкамзаха.

4. Дзеячы, якія належалі да рэвалюцыйна-вызваленчага напрамку нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі:
а) Б.Тарашкевіч; б) С.Прытыцкі; в) В.Ластоўскі; г) І.Лагіновіч.

5. Гістарычная падзея, у выніку якой адбыўся падзел насельніцтва Беларусі ў межах розных дзяржаў:
а) заключэнне Брэсцкага міру; б) заключэнне Версальскага міру;
в) утварэнне ЛітБел; г) падпісане Рыжскага міру.

6. Сведчаннем прыпынення дэмакратычных працэсаў у БССР у канцы 1920-х – 1930-я г.г. былі:
а) згортванне палітыкі беларусізацыі; б) прыняцце Канстытуцыі БССР 1937г.;
в) жорсткая цэнтралізацыя кіравання; г) фабрыкаванне справы "СВБ".

7. Польскія групы супраціўлення ў гады Другой сусветнай вайны аб'ядноўваліся на тэрыторыі Беларусі ў адзіную ваенную структуру пад назвай:
а) Армія Людова; б) Армія Краёва;
в) Беларускі корпус самааховы; г) Беларуская краёвая абарона.

8. Што абазначаюць наступныя скарачэнні :
а) ЛітБел ССР: б) БСГ: в) НТР: г) МТС: д) КПСС.

9. Пасляваеннае аднаўленне Беларусі (1945-1950 г.г.) уключала:
а) пераадоленне наступстваў вайны: б) стварэнне хутарскіх гаспадарак:
в) пераважнае развіцце лёгкай прамысловасці; г) пераважнае развіцце сельскай гаспадаркі.

10. Год, з якога тэрыторыя Заходняй Беларусі знаходзілася ў складзе Польшчы:
а) 1917г.; б) 1919г.; в) 1921г.; г) 1939г.

11. «Рудабельская рэспубліка» была ўтворана ў Бабруйскім павеце падчас:
а) польскай акупацыі 1919г.; б) антысавецкіх выступленняў у 1921г.; в) нямецкай акупацыі ў 1918г.; г) паўстання С.Булак-Балаховіча.

12. Найбольшай папулярнасцю на Беларусі вясной – летам 1917г. карысталася партыя:
а) эсераў; б) бальшавікоў; в) меньшавікоў; г) кадэтаў.

13. Савецкі лётчык, ураджэнец Беларусі, які ў час Курскай бітвы збіў у адным баі 9 самалётаў ворага:
а) М.Гастэла; б) Б.Коўзан; в) А.Гаравец; г) А.Маслаў.

14. Агульная назва ўсіх, каго падазравалі ў барацьбе супраць Савецкай улады:
а) "Ворагі нацыі"; б) "Ворагі Pacii"; в) "Ворагі народа"; г) "Ворагі Сталіна".

15. Упішыце правільны адказ:
а) Аб'яднанне дробных індывідуальных гаспадарак сялян у буйныя калектыўныя гаспадаркі____________.
б) Палітыка афіцыйных улад, якая садзейнічала нацыянальна – культурнаму будаўніцтву на Беларусі ў перыяд 1924- 1929г.г.____________.
в) Палітыка Савецкай дзяржавы, якая праводзілася у 1921- 1928г.г.____________.
г) Назва працэсу аднаўлення добрага імя бязвінна асуджаных__________.